# ЁСЦЬ АБ ЧЫМ ПАГАВАРЫЦЬ

## Першы афіцыйны візіт пасля выбараў Прэзідэнт здзейсніць у Расію

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка плануе здзейсніць афіцыйны візіт у Расійскую Федэрацыю. Пытанні падрыхтоўкі да яго абмяркоўваліся падчас сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Расіі ў Беларусі Аляксандрам Сурыкавым.**

Гэта будзе першы пасля прэзідэнцкіх выбараў візіт Аляксандра Лукашэнкі, і кіраўнік дзяржавы зробіць яго па запрашэнні Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна.

Беларускі лідар падзякаваў за запрашэнне наведаць Расійскую Федэрацыю з афіцыйным візітам. «Гэта правільна будзе, што пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, як звычайна, я наведваю нечужую мне Расію, нават калі гэта камусьці не падабаецца. Думаю, так будзе правільна, і гэта адказ на многія пытанні», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што па лініі Беларусь—Расія адбудзецца шэраг мерапрыемстваў у двухбаковым фармаце. «Мяркую, што і ў шматбаковым фармаце будзем сустракацца з іншымі прэзідэнтамі», — заўважыў таксама беларускі лідар. Ён лічыць, што ёсць пра што пагаварыць, і пагаварыць шчыра, каб у нас не было ніякіх недагаворанасцей. Прэзідэнт падкрэсліў, што «гатовы да адкрытай і сур'ёзнай гутаркі на тэму беларуска-расійскіх адносін».

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў «адкрыта абмеркаваць і праблемныя пытанні, калі яны ёсць, а таксама абазначыць перспектыву». Кіраўнік дзяржавы лічыць, што да маючай адбыцца сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі можна будзе падкарэктаваць напрамкі двухбаковага супрацоўніцтва з тым, каб зняць некаторую насцярожанасць. Разам з тым ён заўважыў, што не бачыць тут асаблівых праблем.

На сустрэчы абмяркоўваўся шырокі спектр беларуска-расійскіх адносін, у тым ліку ў рамках Саюзнай дзяржавы і ЕАЭС, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

# «НЁМАНУ» — 70 гадоў

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў рэдакцыі часопіса «Нёман» з 70-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара гэтага найстарэйшага беларускага літаратурна-мастацкага выдання.**

«За гады свайго існавання часопіс адыграў прыкметную ролю ў развіцці айчыннай літаратуры. Тут друкаваліся найбольш яркія творы беларускіх і замежных аўтараў, актуальная крытыка і публіцыстыка. Сёння «Нёман» працягвае гэтую традыцыю, пастаянна пашыраючы жанравы і тэматычны спектр публікацый», — гаворыцца ў віншаванні. У ім адзначаецца, што часопіс таксама ўносіць дастойны ўклад ва ўмацаванне міжнародных літаратурных сувязяў, аб'ядноўваючы пісьменнікаў розных краін на аснове высокіх творчых прынцыпаў, закладзеных прызнанымі майстрамі мастацкага слова, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

# Дзеці-сіроты будуць атрымліваць жыллё на пяць гадоў

**Гэта прадугледжана ўказам №460, які падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Нормы ўказа №460 удасканальваюць парадак забеспячэння жыллём дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Так, ім будуць прадастаўляцца жылыя памяшканні сацыяльнага карыстання без уліку членаў іх сем'яў і тэрмінам на 5 гадоў. Пасля яго заканчэння жыллё па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў будзе ўключацца ў склад жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання. Пры гэтым дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, на працягу дзеяння тэрміновага дагавора найму жылога памяшкання сацыяльнага карыстання даецца права на льготны крэдыт, у тым ліку ў пазачарговым парадку і без аднясення да катэгорыі малазабяспечаных. Ільготныя крэдыты прапануецца выдзяляць на тэрмін да 40 гадоў, а працэнты за карыстанне імі ўстанавіць у памеры 1% гадавых па аналогіі са шматдзетнымі сем'ямі.

Акрамя таго, указ прадугледжвае аптымізацыю катэгорый грамадзян, якія маюць права на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі, памяншэнне памеру фінансавай дапамогі шматдзетным і маладым сем'ям у пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах пры адмене ўсынаўлення (удачарэння) дзяцей. Мінбудархітэктуры, згодна з указам, створыць і будзе весці адзіную базу звестак грамадзян — атрымальнікаў дзяржаўнай падтрымкі для забеспячэння рэалізацыі прынцыпу аднаразовасці атрымання льготных крэдытаў. Памер ільготнага крэдыту крэдытаатрымальніку будзе разлічвацца з улікам непрацаздольных дзяцей, старэйшых за 23 гады, — інвалідаў I, II груп.

Указ таксама прадастаўляе дзяржаўным органам і арганізацыям права змяніць прызначэнне будынка інтэрната на шматкватэрны жылы дом, калі жылыя памяшканні там адпавядаюць патрабаванням, што прад'яўляюцца да кватэр. Такія памяшканні пры гэтым будуць уключацца ў склад жылля камерцыйнага выкарыстання.

Сродкі, атрыманыя ад платы за карыстанне камерцыйным жыллём, у адпаведнасці з указам будуць ісці не толькі на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў, але і на іх бягучы рамонт у памеры, які не перавышае 10% агульнага аб'ёму.

Указ адносіць да ліку грамадзян, якія маюць першачарговае права на камерцыйнае жыллё ў сувязі з характарам працоўных адносін, асоб, якія накіроўваюцца на працу ў арганізацыі ў адпаведнасці з дамовамі аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту або на платнай аснове. Пры гэтым прапануецца права на забеспячэнне камерцыйным жыллём у Мінску прадастаўляць толькі грамадзянам, не забяспечаным жыллём у сталіцы і ў Мінскім раёне.

Змяняецца парадак збірання платы за карыстанне жыллём камерцыйнага выкарыстання, якое прадастаўляецца грамадзянам з першачарговым правам на яго атрыманне. Такім чынам, на ўмовах дагавора найму на тэрмін працоўных адносін (акрамя аднапакаёвых кватэр) у межах 20 кв. м плошчы на аднаго чалавека трэба будзе плаціць з улікам паніжальных каэфіцыентаў, за астатнюю плошчу — без іх уліку. Сёння за ўсю плошчу аплата ўносіцца з паніжальным каэфіцыентам.

Дакумент уводзіць забарону на пастаноўку на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў грамадзян, якія маюць ва ўласнасці ў населеным пункце па месцы прыняцця на ўлік жылыя памяшканні, прызнаныя не адпавядаючымі ўстаноўленым для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням, непрыдатнымі для пражывання, набытыя шляхам заключэння дагавора куплі-продажу, дарэння, мены пасля прыняцця ва ўстаноўленым парадку рашэння аб прызнанні такога жылля непрыдатным.

# БУДЗЕ ЛАД У СЯМ'І — БУДЗЕ ЛАД І Ў КРАІНЕ

**Аб тым, як вырашаюцца самыя надзённыя праблемы маладых сем'яў, праўленне грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» разглядала на сваім выязным пасяджэнні на прыкладзе Магілёўскай вобласці.**

**Міністр працы і сацыяльнай абароны, старшыня праўлення Беларускага саюза жанчын Марыяна ШЧОТКІНА** ўпэўнена:

— Найлепшай прапагандай сямейных каштоўнасцяў з'яўляецца рэальная падтрымка сем'яў. У Беларусі ўся дзяржаўная палітыка накіравана на паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі, і ёсць рэальныя вынікі.

Справа не толькі ў матэрыяльным фактары. Трэба і надалей вырашаць комплекс пытанняў па духоўна-маральным выхаванні і развіцці моладзі, павышэнні прэстыжу інстытута сям'і.

Як гэта робяць на Магілёўшчыне, расказала старшыня абласной арганізацыі БСЖ Раіса Лычкоўская. Яна нагадала, што вялікая ўвага ў вобласці надаецца замацаванню маладых сем'яў на сяле, стымуляванню сем'яў, якія вядуць прысядзібную гаспадарку, адраджэнню працоўных дынастый.

Так, у Клімавіцкім раёне з поспехам рэалізуецца праект «Шчасце быць разам». Гэта не толькі конкурсы на найлепшыя маладую сям'ю і сельскі падворак, маладзёжнае тэатралізаванае прадстаўленне, але і правядзенне «залатога вяселля», на якое запрашаюць моладзь.

У Магілёве, Бабруйску, Бялыніцкім, Горацкім, Кіраўскім, Дрыбінскім раёнах створаны клубы маладой сям'і. У Горках і Бялынічах пры аддзелах ЗАГСа працуюць службы дапамогі маладой сям'і, праводзяцца «круглыя сталы», лекцыі, гутаркі на тэмы «Шлюбны кантракт», «Прававыя гарантыі маладым сем'ям», «Дзеці — гэта сур'ёзна», адбываецца ўрачыстая рэгістрацыя дзяцей у Дзень маці і Дзень сям'і. Актыў першасных і раённых арганізацый БСЖ сумесна з цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ў Дрыбіне і Глуску курыруюць клубы маладых бацькоў «Тата-школа» па падрыхтоўцы да нараджэння дзіцяці і ўключэнні мужчын у актыўнае выхаванне дзяцей. Ва ўсіх раёнах вобласці праводзяцца масавыя сямейныя мерапрыемствы: «Мама, тата, я — спартыўная сям'я», «Парад дзіцячых калясак», «Гэты дзень для цябе, мама!», «Чароўны малы», «Я + Я = маладая сям'я», конкурсы на найлепшае падвор'е маладой сям'і.

Удзельнікаў нарады ўразіла практыка Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы. Урачы расказалі, што менавіта дапамога БСЖ, у першую чаргу Надзеі Ермаковай, дапамагла ім заняць пазіцыі лідараў. Надзея Ермакова ў свой час «пачула» голас магілёўскіх дзіцячых медыкаў і знайшла спонсараў для набыцця ўнікальнага медабсталявання, якое дазваляе рабіць хірургічныя аперацыі немаўлятам.

Сапраўдным адкрыццём дня стала знаёмства з вопытам Круглянскага раёна. Бо той узровень сацыяльных, бытавых, спартыўных і забаўляльных паслуг робіць жыццё мясцовай моладзі набліжаным да таго, чым так спакушае горад. Варта толькі зазірнуць у агратурыстычны комплекс «Нікольскія сажалкі», які выдатна ілюструе ролю асобы ў гісторыі.

Бо «Сажалкі» і яшчэ шматлікія круглянскія цуды — усё гэта ініцыятыва і нястомная праца начальніка Круглянскай ПМК-266 Мікалая Патрончыка, які кожны дзень сваім прыкладам даказвае, што патрыятызм і дзяржаўны ўзровень — гэта не высокія словы, а сумленныя справы. Такая выснова вельмі блізкая для Беларускага саюза жанчын, бо асобы с БСЖ менавіта так жывуць і працуюць.

**Ларыса РАКОЎСКАЯ.**


**ОАО «Нафтан»**
**РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ**
(с повышением начальной цены)
**БЫВШЕЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО:**

| Пометка на конверте | Наименование | Инв. № | Год выпуска | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| Реализация неликвидов. 17.12.2015. | МАЗ 104С (Автобус), гос. № ВЕ 16-02 | 13150554 | 2000 | 114 000 000 |
| | ПАЗ-3205 (Автобус), гос. № ВЕ 8855 | 13000032 | 2003 | 21 600 000 |
| Реализация неликвидов, Медтехника. | Аппарат пескоструйный/ VARIO BASIC | 06253443 | 2009 | 7 320 000 |
| | Печь для литья сплавов/ NAUTILUS CC plus | 06253449 | 2009 | 94 800 000 |
| | Оборудование стоматологическое лабораторное/ PROGRAMAT P500 | 06253528 | 2009 | 31 560 000 |
| | Кастрюля для полимеризации пластмассы/ POLYCLAV/ | 06273529 | 2009 | 4 800 000 |
| | Камера для диагности кариеса Vistaproof | 06273531 | 2009 | 25 440 000 |
| | Камера интраоральная Vistacam CL | 06276052 | 2009 | 24 840 000 |
| Реализация неликвидов. Экспорт медтехники.* | Прибор для сверления отверстий под штифты/ TOP SPIN | 06253441 | 2009 | 6 600 000 |
| | Устройство полировальное EWL 80 (WP-Ex 2000) | 06253532 | 2009 | 30 120 000 |
| | Пресс гидравлический | 06273501 | 2009 | 3 720 000 |

**реализуется только за пределы Республики Беларусь.*

Состояние удовлетворительное.
Предложения принимаются по адресу: **211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 17 декабря 2015 года с пометками на конверте, указанными в таблице.**
Извещения на проведение конкурса размещены на сайте **www.naftan.by.**
Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, (033) 398 08 48, (033) 398 07 67.

УНП 300042199



Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| Продавец | **Открытое акционерное общество «Трест Белтрансстрой», 220050, г. Минск, ул. Советская, 8** |
| Лот № 1: | СКЛАД СЫПУЧИХ МАТЕРИАЛОВ, общей площадью 126,3 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47336, **г. Брест, ул. Карасева, 100. Начальная цена лота с НДС 20% – 85 060 530 бел. руб. (снижена на 80%).** |
| Лот № 2: | РАСТВОРНЫЙ УЗЕЛ, общей площадью 498,7 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47330, **г. Брест, ул. Карасева, 100. Начальная цена лота с НДС 20% – 421 152 420 бел. руб. (снижена на 80%).** |
| Лот № 3: | МЕХАНИЧЕСКИЙ СКЛАД ЦЕМЕНТА, общей площадью 45,2 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47322, **г. Брест, ул. Карасева, 100. Начальная цена лота с НДС 20% – 38 941 170 бел. руб. (снижена на 80%).** |
| Лот № 4: | ЗДАНИЕ КОМПРЕССОРНОЙ СТАНЦИИ, общей площадью 62,4 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47332, **г. Брест, ул. Карасева, 100. Начальная цена лота с НДС 20% – 69 624 130 бел. руб. (снижена на 80%).** |
| Лот № 5: | СКЛАД СУХИХ ЛЕСОМАТЕРИАЛОВ, общей площадью 501,7 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47323, **г. Брест, ул. Карасева, 100. Начальная цена лота с НДС 20% – 845 503 720 бел. руб. (снижена на 50%).** |
| Лот № 6: | ПАРОВАЯ ЛЕСОСУШИЛКА, общей площадью 71,5 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47325, **г. Брест, ул. Карасева, 100/6. Начальная цена лота с НДС 20% – 538 852 740 бел. руб.** |
| Лот № 7: | ПРИСТРОЙКА К ПИЛОРАМЕ, общей площадью 348,3 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47328, **г. Брест, ул. Карасева, 100/5. Начальная цена лота с НДС 20% – 1 345 104 190 бел. руб.** |

**Сведения о земельном участке и сроках подписания договора купли-продажи**: Лоты № 1–7 расположены на земельном участке пл. **2,5638 га** предоставленном продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производственной базы. Продавец, в зависимости от количества реализованных лотов, в установленном законодательством порядке после проведения аукциона обращается за осуществлением регистрационных действий в отношении земельных участков, необходимых для обслуживания предметов аукциона. После выделения самостоятельного земельного участка для обслуживания реализованного лота (лотов) между продавцом и покупателем в течение 5 (пяти) рабочих дней после получения продавцом свидетельства о государственной регистрации земельного участка должен быть подписан договор купли-продажи

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Оплата за предмет аукциона (лот) производится в порядке, установленном в договоре купли-продажи

**Порядок проведения аукциона,** оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | **18.12.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Советская, 8, ОАО «Трест Белтрансстрой»** |
| Дата и время окончания приема документов | **16.12.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Контактные телефоны | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |